Эти факты свидетельствуют о необходимости расширения велосипедной инфраструктуры в Минске в целях сохранения безопасности и улучшения качества жизни горожан.

УДК 741+378.147.025.7

## Педагагічнае майстэрства мастака-настаўніка і яго існасць

Барбарчык М.І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Пры выкладанні творчых дысцыплін узнікаюць складаныя і шматлікія перашкоды, з'яўляецца неабходнасць задумацца над рознымі пытаннямі методыкі навучання, якія ляжаць на паверхні. Яны ўзнікаюць не адразу, а праяўляюцца паступова і неспрактыкаванаму воку нябачныя. Гэтая сітуацыя патрабуе пэўных намаганняў, а творча-педагагічны вопыт выкладчыка ў такіх выпадках цяжка пераацаніць. Менавіта выкладчык з'яўляецца ў сістэме адукацыі тым суб'ектам, які непасрэдна перадае веды вучню. І ад яго прафесійных якасцей, як творцы, так і педагога, а таксама чалавечых якасцей залежыць поспех навучання будучых архітэктараў, інжынераў, мастакоў і г.д. Дзеля плённага і паспяховага вучэбнага ўзаемадзеяння мастака-педагога і яго вучняў важны аўтарытэт настаўніка як творцы. З асабістага вопыту памятаю, якімі шчаслівымі і ганарлівымі былі мы, студэнты, тым, што творы жывапісу нашага настаўніка на Рэспубліканскіх мастацкіх выставах выглядалі аднымі з лепшых. Такая рэчаіснасць выклікае ў навучэнцаў не толькі захапленне талентам майстра, але і несумненны давер да яго як да настаўніка. Нельга не нагадаць агульнапрынятыя ў адукацыйнай сістэме асабістыя якасці выкладчыка, яго педагагічныя здольнасці, якія павінны быць уласцівы і педагогу-мастаку. Гэта ў першую чаргу пачуццё такту. Выкладчык, які валодае тактам, заўсёды стрыманы і патрабавальны; ён аб'ектыўны і пазітыўны ў сваіх дзеяннях адносна пэўнай сітуацыі. Ён здольны слухаць і чуць субяседніка. Валодае назіральнасцю і самавалоданнем. Немалаважным для педагога з'яўляецца дыялектычнае мысленне – неабходная якасць розуму добрага педагога, якая дазваляе назіраць і аналізаваць здольнасці студэнта, бачыць здольнасці вучняў ва ўсёй разнастайнасці ўласцівасцей і якасцей і накіроўваць вучэбны працэс у патрэбнае рэчышча.

Педагагічнае майстэрства таксама вызначаюць такія якасці, як прафесійная інтуіцыя (вынік вялікай колькасці назапашаных ведаў); мэтанакіраванасць як адна з асноўных валявых якасцей; настойлівасць і сістэмнасць у выкладанні як рыса асобы, здольнай даводзіць пачатую справу да канца.

Мастак-педагог – гэта чалавек, які валодае педагагічнай культурай, г. зн. высокім узроўнем адукаванасці, вобразнага мыслення, гуманістычным светапоглядам, прыкладам укладу жыцця.